**EGZAMIN PISEMNY**

Olimpiada Języka Białoruskiego – XXIV edycja
Zawody II stopnia (okręgowe)
Hajnówka,  18 stycznia 2018 roku

**І. Устаў, згодна з вымаўленнем, е альбо я. (10 пунктаў)**

**Уладзімір Караткевіч**

***Мова***

Ёсць паданне вякоў, што разбурыць калісь
Вавілонскую Вежу Адам
І няўмольна сальюцца мовы зямлі
У адну, няродную нам.
І мая безвыходна пойдзе у змрок,
У атрутны, як вечнасць, цень,
Трапяткая і сіняя, як васілёк,
Гарачая, як прамень.
Я ні шчасця, ні будучых дзён н__ **(1)** жадзён,
Хай пятля, хай памерці ў журбе,
Хай н__ **(2)** будзе ні шчасця, ні будучых дзён,
Калі ў іх н__ **(3)** будзе цябе.
Сірата па з'едлівай волі багоў,
Гінучы мой карабель,
Хай н__ **(4)** будзе світання ў народа майго,
Калі досвіткам здрадзіць цябе.
Ад палеткаў райскіх лёгкай ступой,
Збочу я да пякельных катлоў,
Калі першы жа ангел на мове маёй
Мне н__ **(5)** скажа: «Братка, здароў».
І няхай да мяне н__ **(6)** прыйдзе вясна,
Песня, шчасце, каханне, спакой, —
Ўсё адно н__ **(7)** змяняю твой чорны праснак
На атруту пшаніцы чужой.
Ты мой ясны хлеб і каханы май,
Песня продкаў, нашчадкаў палі,
Б__з **(8)** цябе, н__ **(9)** з табой — н__ **(10)** патрэбен мне рай
На душы. Ў небясі. На зямлі.

Уладзімір Караткевіч, *Каласы пад сярпом тваім*, Мінск 1995.

**II. Запішы дзеясловы з дужак у адпаведнай асабовай форме простага будучага часу. (5 пунктаў)**

*1.* Пакуль не ведаю, што _____________ з алімпійскім медалём. *(зрабіць)*

*2.* Мы ____________ у роднай мове шмат каштоўнага. *(знайсці)*

3. А што будзе, калі вы ____________ праўду? *(сказаць)*

4. Хочацца спадзявацца, што сябры паэта __________ ягоную літаратурную спадчыну. *(зберагчы)*

*5.* Ён спакойна _____________ старонку свайго жыцця і ўсё будзе добра. *(перагарнуць)*

**III. Дапоўні сказы ўтворанымі ад назоўнікаў у дужках прыметнікамі. (5 пунктаў)**

1. Родная мова, ___________ *(цуд)* мова!
Ты нашых думак уток і аснова!

2. ___________ *(маці)* дарунак ад самай калыскі,
ты самацветаў яскравая нізка.

*(М.Танк)*

3. Каля пасады _______________ *(ляснік)*
Цягнуўся гожаю падковай
Стары, высокі лес цяністы.

*4.* Тут верх асіны _____________ *(круглы ліст)*
Сплятаўся з хвоямі, з дубамі…

*(Якуб Колас)*

5. Ад родных ніў, ад роднай хаты
У __________ *(пан)* двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.

*(М. Багдановіч)*

**IV. Замяні прыметнік сінонімам, а назоўнік - антонімам. Запішы новыя словазлучэнні (10 пунктаў).**

1 пакутніцкая смерць – _______________ ________________

2 мізэрнае шчасце – _______________ ________________

3 складанае пытанне – _______________ ________________

4 спякотная ноч – _______________ ________________

5 людская міласэрнасць – _______________ ________________

## V. Пустыя месцы ў тэксце запоўні словамі для ўстаўкі ў адпаведнай форме. Звярні ўвагу, што слоў для ўстаўкі на два больш. (10 пунктаў)

**словы для ўстаўкі:** відаць, нарэшце, неверагодна, з’ездзіць, прагаварыць, убачыць, раніцай, забыцца, накласці, модны, стары.

**Сакрат Яновіч**

***Гутарка з маці***

Я непрабачальна доўга не мог прыбрацца з часам, каб ______________ (1) да маці. Калі, _______________ (2), быў я ўжо ў дарозе, мяне чамусьці здзівіла тое, як мала змяняецца лес!

Яна не _________________ (3) мяне, па-будзённаму сядзела папоцемку ў звечарэлай нашай ________________ (4) хаце (бацька якраз некуды пайшоў).

Я ___________________ (5) з ёю да першых пеўняў.

Бацька вярнуўся падпітым і, _______________ (6) мяне, неяк засаромеўся...

Ад'ехаў я позняй ________________ (7).

Маці _________________(8) была ў маю _________________(9) сакваяжыну «Кантыненталь» - цыбулі, буракоў, бульбы. Мне, памятаю, хацелася рассмяяцца ад таго: ________________(10), няшмат я тады разумеў з жыцця.

Сакрат Яновіч, *Сцяна. Раман. Апавяданні*, Мінск 1997.

## VI. Перакладзі на польскую мову. (25 пунктаў)

Я забыўся ў гэту ноч пагасіць свечку на століку ля акна і ляжаў у шырокім, як луг, ложку, ужо засынаючы, калі маю дрымоту перарвалі зноў крокі ў калідоры. Ведаючы, што зноў нікога не заўважу, калі выгляну, я ляжаў спакойна. Хутка крокі зніклі. Я пачаў быў зноў драмаць, калі раптам страпянуўся.

Праз шыбу глядзеў на мяне чалавечы твар.

Чалавек быў сапраўды вельмі маленькі (я бачыў яго амаль па пояс), у каптане з шырокім каўняром. Гэта быў чалавек і ўсё ж нечалавечая істота. Яе галоўка была сціснута з бакоў і ненатуральна выцягнута ў даўжыню, рэдкія доўгія валасы звісалі з яе. Але самым дзіўным быў твар Малога Чалавека. Ён быў амаль такі зялёны, як вопратка, рот вялікі і без вуснаў, нос маленькі, а ніжнія павекі былі непамерна вялікія, як у жабы. Я параўнаў яго з малпай, але хутчэй гэта быў твар сапраўднай жабы. І вочы, шырокія, цёмныя, глядзелі на мяне з тупой злосцю і яшчэ чымсьці незразумелым. Пасля з’явілася ненатуральна доўгая зеленаватая рука. Істота глуха застагнала, і гэта абудзіла мяне ад здранцвення. Я кінуўся да акна і заўважыў, што Малога Чалавека няма. Ён знік.

Я з трэскам адчыніў акно – халоднае паветра лінула ў пакой. Высунуўшы галаву, я глядзеў на ўсе бакі – нікога. Ён як выпарыўся. Скокнуць уніз ён не мог, у гэтым месцы пад двума паверхамі быў яшчэ трэці (дом стаяў часткова на схіле), вокны справа і злева былі зачынены, ды і карніз быў такі вузкі, што па ім не прабегла б і мыш. Я зачыніў акно і задумаўся, упершыню ўзяўшы пад сумненне свае разумовыя здольнасці. […]

Уладзімір Караткевіч, *Дзікае паляванне караля Стаха* [online:] http://kamunikat.org